Вольга Камендантава



Намеснік дырэктара
Віцебскай абласной
бібліятэкі імя У.І. Леніна

# І ВЕЧНЫМ ЗАСТАНЕЦЦА СЛОВА...

Наталля Пугачова



Загадчык аддзела
Віцебскай абласной
бібліятэкі імя У.І. Леніна

Гэты год у нашай краіне праходзіць пад зоркай Скарыны і адзначаны святкаваннем паўтысячагадовага юбілею беларускай кнігі. І нягледзячы на тое, што кульмінацыйным месяцам стане верасень – менавіта ў гэты час адбудзецца найбольшая колькасць самых знакавых імпрэз, – ужо сёння варта згадаць некаторыя з падзей, якія плануюць адбыцца ў бібліятэчных установах вобласці.

Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў Прыдзвінскім краі распрацавана Праграма мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і святкаванні ў 2017 г. Дня беларускага пісьменства ў Полацку, сфарміраваны Зводны план работы публічных бібліятэк Віцебскай вобласці, які ўключае комплекс навуковых, адукацыйных, асветніцкіх, віртуальных праектаў, скіраваных на фарміраванне ведаў па гісторыі беларускай кнігі, знаёмства са знакамітымі дзеячамі беларускай літаратуры, а таксама кніжнымі помнікамі і рарытэтнымі выданнямі.

На працягу года ў бібліятэках вобласці адбудуцца навукова-практычныя канферэнцыі, семінары «Беларуская кніга як падмурак фарміравання духоўнасці», «Ад Полацка пачаўся свет», пройдуць круглыя сталы «Спадчына Францыска Скарыны», «Рэдкія выданні і кніжныя калекцыі краю». Галоўнай навуковай падзеяй у бібліятэчным жыцці 2017 г. стане правядзенне ў лістападзе III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», якая таксама ўключана ў праграму святочных мерапрыемстваў. Праблемнае поле канферэнцыі, якую ўжо можна лічыць традыцыйнай, вызначана даволі шырока: гісторыя кнігі і кніжныя помнікі, этнаграфія і фальклор, гістарычнае, бібліятэчна-бібліяграфічнае, музейнае і царкоўнае краязнаўства, крыніцы па гісторыі Падзвіння, краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Па выніках работы канферэнцыі будзе выдадзены зборнік матэрыялаў.

Трэба нагадаць, што ў красавіку гэтага года ўбачыў свет другі том «Віцебскага края». Прынамсі, галоўнай яго тэмай таксама стала гісторыя беларускага кнігадрукавання: II Міжнародная канферэнцыя, матэрыялы якой увайшлі ў зборнік, была прымеркавана да 385-годдзя выдання Буквара Спірыдона Собаля ў друкарні Куцеінскага манастыра. У канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 60 краязнаўцаў, гісторыкаў, супрацоўнікаў бібліятэк, музеяў, архіваў, вышэйшых навучальных устаноў з Беларусі, Расіі і Латвіі. Электронны варыянт зборніка, даступны для скачвання, размешчаны на афіцыйным сайце Віцебскай абласной бібліятэкі.

Бібліятэкары выступяць ініцыятарамі і актыўнымі ўдзельнікамі шматлікіх конкурсаў: «Слова ў пераплёце» (літаратурны), «Вяртанне праз стагоддзі» (па стварэнні відэаролікаў), «Кніга як АРТ-аб'ект» (дэкаратыўна-прыкладны). Апошні конкурс, арганізаваны Віцебскай цэнтральнай раённай бібліятэкай, ужо выйшаў на фінальную стадыю і ў хуткім часе яго ўдзельнікі паспаборнічаюць у намінацыях «Супервокладка», «Інсталяцыя да літаратурных твораў», «Кніга-сувенір», «Кніжная закладка». З 1 мая ўступіў у актыўную фазу бібліятэчны конкурс фотаработ «Кніга – мой сябар», аб'яўлены аддзелам літаратуры па мастацтве Віцебскай абласной бібліятэкі. Вынікі конкурсу будуць абвешчаны падчас святочных мерапрыемстваў да Дня бібліятэк Беларусі.

Бібліятэка імя У. Караткевіча цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Віцебска правяла ўрок радзімазнаўства «Вялікі твой шлях, кніга!» і арганізавала акцыю «А як бы я ўпрыгожыў пачатковую літару старажытнай кнігі», удзельнікамі якой сталі навучэнцы гімназіі № 3 імя А. Пушкіна. Кожнаму вучню было прапанавана размаляваць на свой густ літары, а напрыканцы мерапрыемства скласці імя славутага першадрукара.

Не менш цікавым было ўдзельніцтва выхаванцаў абедзвюх сярэдніх школ гарадскога пасёлка Шаркаўшчына ў інтэрактыўнай гульні «Францыск Скарына! Хто ты?» і майстар-класе па напісанні літар кірылічным пісьмом, які быў праведзены выкладчыкам дзіцячай школы мастацтваў, сябрам Саюза мастакоў Беларусі Віктарам Крукам. У выніку была прэзентавана рукапісная кніга і створана асабістая пячатка дзіцячай бібліятэкі «Совушка».

Трэба адзначыць, што майстар-класы як даволі спецыфічная форма работы для бібліятэк набывае ўсё большую папулярнасць. Так, у Віцебскай абласной бібліятэцы распачаўся новы асветніцкі праект для дзяцей і падлеткаў «Падарожжа ў гісторыю кнігі», у праграму якога ўвайшоў цыкл тэматычных майстар-класаў: «Гліняныя таблічкі сваімі рукамі», «Папірус з паперы», «Самаробная берасцяная грамата», «Кнігі з бамбука і пальмавых лісцяў», «Кніга-гармонік і кніга-веер сваімі рукамі».

У рамках праекта ў сакавіку ў абласной бібліятэцы прайшлі мерапрыемствы з удзелам кандыдата культуралогіі, намесніка дырэктара па навуковай і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алеся Сушы. Супрацоўнікі аддзела дзіцячай літара-

туры запрасілі на прэзентацыю кніг пра Францыска Скарыну навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў горада. Падчас творчай сустрэчы, на якой прысутнічалі гісторыкі, выхаванцы Віцебскай духоўнай семінарыі, Алесь Суша адзначыў шэраг рэспубліканскіх і міжнародных мерапрыемстваў, што будуць рэалізаваны ў рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

Сёння на базе публічных бібліятэк рэалізуецца значная колькасць праектаў і мэтавых праграм па папулярызацыі кніжнай спадчыны: «Кніга ў культурнай прасторы Лепельшчыны» (Цэнтральная раённая бібліятэка Лепеля), «Шлях да кнігі» (Відзаўская гарпасялковая бібліятэка Браслаўскага раёна), «К книге – через театр кукол» (Наваполацкая дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака) і інш.

Да юбілейнай даты бібліятэкі сумесна з музеямі і іншымі ўстановамі мяркуюць ладзіць сумесныя мерапрыемствы, якія дазволяць апынуцца ў атмасферы скарынаўскай эпохі: змястоўныя экспазіцыі і музейныя ўрокі, крэатыў-лабараторыі і майстар-класы. У вобласці адбудуцца святы кнігі «У год 500 ад Бібліі Скарыны…» (Лёзна), «Гімн пісьменству з далёкіх часоў» (Аршанскі раён), «Нам кніга, як сонца, асветліць абшар» (Віцебск), літаратурныя гасцёўні, прэзентацыі кніг сучасных беларускіх пісьменнікаў, медыяпадарожжы і інш.

Аднак найбольш адметныя культурныя падзеі пройдуць у верасні ў старажытным Полацку на шматлікіх пляцоўках горада: ля сцен Сафійскага сабора, Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, помнікаў Ф. Скарыне, Сімяону Полацкаму. Бібліятэчныя ўстановы разгорнуць літаратурныя пляцоўкі і выставы, правядуць квэсты і літаратурныя прэзентацыі.

У рамках свята «Скарынаўскія дні ў Полацку» будуць падведзены вынікі рэспубліканскай акцыі «Лето с хорошей книгой!», для дзяцей пройдзе конкурс малюнкаў на асфальце «Книга в рисунках» і выстава перыядычных выданняў «Детская пресса на все интересы». У чытальнай зале пад адкрытым небам ля памятнага знака «Полацк – геаграфічны цэнтр Еўропы» адбудзецца майстар-клас па вырабе рукапіснай кнігі «Створым кнігу разам» і будзе экспанавацца абласная выстава-агляд самаробнай кнігі, ініцыятарам і каардынатарам якой выступае Віцебская абласная бібліятэка. У бібліятэках горада пройдуць краязнаўчыя сустрэчы «Не мялеюць Скарынавы вытокі», адбудзецца кніжнае дэфіле «Слава кніжцы беларускай», конкурсная праграма «Літаратурны бульвар».

…А тым часам цікавыя і змястоўныя мерапрыемствы мусяць адбыцца і ў іншых населеных пунктах рэгіёна. Роднае слова, што гучыць праз стагоддзі ў друкаваных радках паслядоўнікаў Ф. Скарыны, і сёння асвятляе нашы душы і вядзе за сабой нязменным шляхам – шляхам асветніцтва і духоўнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. **Што чакае** палачан на святкаванні Дня беларускага пісьменства [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ximik.info/news/shto-chakae-palachan-na-svyatkavanni-dnya-belaruskaga-pismenstva-15148. – Дата доступу: 03.05.2017.

2. **Як Полаччына** святкавала «Скарынаўскія дні» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.pvestnik.by/?p=17742. – Дата доступу: 03.05.2017.

## Summary

Program of events of the 500th anniversary of Belarusian printing in Vitebsk libraries.